*„Я азёрную сінечу* вуснамі *лаўлю*", — пяецца ў песьні. Чаго толькі ні робіцца *вуснамі* — прамаўляюцца лёзунгі, шэпчуцца прапановы, смакуецца пітво і чыесьці іншыя *вусны.*

*„Ногі падкасіліся і ў мне, і ў ёй. Зьліліся* вусны з вуснамі *самі сабой*", — клясычныя купалаўскія радкі. Вусны зліваюцца, дакранаюцца, датыкаюцца. *Вусны* гарачыя, палымяныя, прагныя. Ну, вядома ж, яны могуць быць, як маліны ці як вішні.

Ад *вуснаў* утварыліся і *вусы.* Хоць *вусы* — зусім не абавязковая дэталь да *вуснаў. Вусьціш* — найперш ціш, зьмяненьне, зьнерухомленьне *вуснаў. Вусень* насамрэч падобны да *вуснаў* сваімі плаўнымі, пераборлівымі, прагнымі рухамі па сваёй сакаўной ежы. Па *вуснах* заўжды смак — салоны смак крыві, салодкі смак суніцаў ці горкі смак праўды.

Па *вуснах* мяркуюць і пра людзей наагул. Бо *вусны* бываюць зычлівымі і пажадлівымі, злымі і ласкавымі, бязвольнымі і рашуча сьціснутымі. Зь іх мы чуем вітаньні і праклёны, шчырыя малітвы і шчырую ману, пустыя дэклярацыі і словы гонару. Зь іх і тчэцца нашая *вусная гісторыя,* заўсёды праўдзівейшая, чым гісторыя пісьмовая, бо сказанае *вусна* ўжо ня выправіш. Бо яе ж выслаўляюць жывыя людзкія *вусны.*

# Газэта

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

Словам „*газэта*" некалі ў Вэнэцыі называлі манэту, якой плацілі за друкаваны інфармацыйны ліст, які ўласна і быў *газэтай* у цяперашнім сэнсе слова.

Першая беларуская нелегальная *газэта* („Мужыцкая праўда") зьявілася яшчэ ў мінулым стагодзьдзі, а вось першая легальная — „Наша доля" — толькі ў гэтым.

Паколькі асноўнае прызначэньне *газэты* — праўдзіва інфармаваць — савецкія *газэты* не выконвалі, народ таксама ўжываў іх не паводле прызначэньня. Адны, ува ўмовах дэфіцыту паперы для прыбіральні, замянялі яе *газэтай.* Другія закаркоўвалі *газэтай* бутэлькі з алеем і самагонкай. Трэція — мылі *газэтай* вокны, білі ёй мух, скручвалі зь яе цыгаркі і распальвалі дровы ў печы, празь яе прасавалі штаны, у яе загортвалі ежу ў дарогу, рэзалі на ёй закуску. Пры гэтым *газэта* ніколі не ўжывалася як сурвэтка. Рот і рукі выцiралі рукавом, аб штаны або яшчэ як.

У войску, у зімовы час, *газэты* ўжываліся замест анучаў. *Газэта* лепш трымала цеплыню.

Разам з тым *газэта* была апошняй надзеяй шукальнікаў праўды. У *газэту* скардзіліся, і надрукаваная скарга нярэдка дапамагала вырашыць праблему.

У назвах савецкіх *газэтаў* адбівалася ўся ідэалёгія камунізму: старадароскі „Поступ кастрычніка" пад лепельскім „Ленінскім сьцягам" выходзіў на петрыкаўскія „Новыя рубяжы" і крупскім „Ленінскім курсам" ішоў да пружанскай „Зары камунізму". Аповед можна працягваць...

Чытачы ставіліся да *газэтаў* па-рознаму. Бальшыня сьвята верыла ў магію надрукаванага слова.

Напрыканцы XX стагодзьдзя *газэту* ўсё часьцей і часьцей пачаў замяняць тэлевізар.